**Бялоў У.І.,** *дацэнт*

# СПЕЦЫФІКА ВЫКАРЫСТАННЯ ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ У ПАЗНАВАЛЬНЫХ ПРАГРАМАХ

У пазнавальных праграмах публіцыстычны матэрыял выкарыстоўваецца на аснове ўзаемасувязі ідэйна-грамадскай мэты праграмы, накіраванасці зместу пазнавальнай праграмы і ўліку сацыяльна-псіхалагічнай сітуацыі, якая ўзнікае ў выніку пэўных адносін аўдыторыі да тэмы пазнавальнай праграмы.

Сацыяльная накіраванасць зместу пазнавальнай праграмы патрабуе асаблівага падыходу да публіцыстычнага матэрыялу, які павінен мець практычную накіраванасць на рашэнне бягучых праблем. Адсюль неабходнасць стварэння тэкстаў з улікам прамога звароту да аўдыторыі, зносін з аўдыторыяй, у працэсе якіх могуць быць выкарыстаны тэхнічныя .сродкі.

Публіцыст не проста інфармуе аўдыторыю, але і запрашае яе ў субяседнікі, у сааўтары, улічваючы, што аўдыторыя з'яўляецца яго духоўным аднадумцам. ·



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У тэксце павінна яскрава адчувацца аўтарская пазіцыя, ацэнка фактараў і падзей. Аўтарская прысутнасць з'яўляецца адной з асаблівасцей публіцыстычнай творчасці.

У аснове сапраўднай публіцыстыкі - вобразна выказаная актуальная думка, таму публіцыстычнасць - гэта заўсёды доказ, атрыманы ў выніку даследавання фактаў.

Даследчык В.А.Шпагін прапануе тры групы сцэнічных форм публіцыстыкі:

1. Формы інфармацыйна-камбінаванага тыпу (гутаркі за круглым сталом, лекцыі, дыспуты, сустрэчы каментатараў і г. д.).

2. Формы ілюстрацыйна-камбінаванага тыпу (лекцыя-канцэрт, лекторый, кіналекторый).

3. Формы тэатралізаванага тыпу (літаратурна-музычная кампазіцыя, тэатралізаваныя прадстаўленні, грамадскія святы).

Гэтыя формы павінны мець выразны публіцыстычны змест з такімі ўстойлівымі рысамі, як дакументальнасць і сінкрэтызм. Дакументальнасць форм публіцыстыкі падкрэсліваецца тым, што апошняя мае прамую сувязь з грамадскай і вытворчай дзейнасцю канкрэтнага калектыву. Патрэба адлюстравання жыцця гэтага калектыву абумоўлівае дакументальнасць драматургіі. Структурна гэта можа быць простая канстатацыя фактаў жыцця ўдзельнікаў, месца і часу падзеі ці мастацкае абагульненне дакументаў аб падзеях у калектыве. Пры гэтым дакументальнасць надае зместу пазнавальнай праграмы пэўнасць і стварае ўмовы для актывізацыі аўдыторыі.

Сінкрэтызм (у перакладзе з грэчаскага - злучнасць), як адзін са спосабаў аб'яднання матэрыялу, арганічнай злучнасці дакументальнага і мастацкага ў адзінае цэлае, з'яўляецца адным з важных патрабаванняў да драматургіі сцэнічных форм публіцыстыкі.

Умовай для актыўнасці аўдыторыі з'яўляецца стымуляванне асяроддзя, што ствараецца на аснове:

- сацыяльна значнага зместу пазна-вальнай праграмы;

- сістэмы выразных сродкаў, якія забяспечваюць эмацыянальнае ўспрыманне зместу;

- сістэмы нефармальных сувязей і адносін, якія ўзнікаюць сярод людзей, што прысутнічаюць на пазнавальнай праграме.